Аддзел па адукацыі  Кобрынскага райвыканкама
ДУА "Павіццеўская сярэдняя школа"

# ЖЫЦЬ НА СВАЁЙ РАДЗІМЕ!

## Конкурс "Мая Радзіма – Беларусь"


Работу выканала
вучаніца 6 класа
ДУА "Павіццеўская
сярэдняя школа"
Брэсцкая вобласць
Кобрынскі раён, аг.Павіцце
Цецярук Ганна Мікалаеўна,
26.04.2012 г.н.
аг.Павіцце
вул.Гастэла
д.4
lila1981@tut.by
+375333956149

Вандроўкі, падарожжы, ваяжы…Гэтыя словы з дзяцінства цешаць мой слых. Я ў захапленні ад цёмна-зялёных халодных вод Балтыкі, прыемна-ласкавых хваль Чорнага мора, вузкіх вулачак Італіі, санкт-пецярбургскіх белых начэй.

Але калі я бачу бязмерныя пшанічныя палі, смарагдавыя лугі з жоўтымі сонейкамі, васільковыя павольныя азёрныя прасторы – сэрца пачынае біцца ў тахт спевам птушак, разрываючыся на мільёны ўсмешак. Бо гэта ўсё мая родная Беларусь – мой любімы куток, бацькоўская спадчына, месца маіх мар і спадзяванняў.

Але найбольш міла майму сэрцу мая родная вёсачка – Павіцце. На першы погляд яна самая звычайная, але так можа сказаць толькі той, хто ніколі не быў у нас у гасцях.

А гасцям мы заўсёды рады! Кожны жыхар вёсачкі гасцінна расчыніць дзверы падарожнаму і з радасцю раскажа незвычайную гісторыю пра мясцовую вядзьмарку альбо пра нясметныя скарбы, якія схаваў багаты шляхціц. А потым вытапіць сасновую лазню, папарыць бярозавым венічкам, адразу вярнуўшы дзясятак год госцю. А пасля запросіць за раскошны стол з павіццеўскімі стравамі, і толькі ў нас падарожны пачастуецца поскріптухам, палёхамі са шкваркамі, бабовымі вярэнькамі, варанай бульбай з салёным творагам, гугелем …І ўсе мары госця пра Турцыю ды пра Егіпет ушчэнт разаб’юцца і знікнуць назаўсёды, калі яго запросяць на ранішнюю рыбалку і ён убачыць амарантавы ўсход сонца, грацыёзнага чорнага бусла ды серабрыстых шчупачкоў на вудзільні.

А колькі незвычайных мілагучных слоў вы пачуеце з вуснаў нашых жыхароў, бо нашы вяскоўцы не грэбуюць матулінай мовы, не забываюцца на яе, а з радасцю размаўляюць на ёй. “Манё, твоя тэлушка бігае на стадыёновэ, кідай свого порсючка ў майдані – бэжі хучій!” –крычыць суседка суседцы праз плот. “Тож тая волоцюга выцікана ніяк дохаты нэ прысунэцця!” – крыкне на бягу цётка Марыя. Вам канечне стала цікава, пра што ж гэта яны плявузгалі – прыязджайце да нас у госці – з радасцю раскажам!

Вы думаеце нам больш няма чым здзівіць заядлага падарожніка? Дарма! Калі вам пашчасціць трапіць на сапраўднае вяселле па-павіццеўску, то, абяцаем вам, без уражанняў вы не застанецеся! Самай незвычайнай, неардынарнай асобай на вяселлі з’яўляецца сваха. Вы ўбачыце мажную жанчыну ў баваўнянай сарочцы, чорнай спадніцы, паверх якой завязаны фартух. І фартух, і сарочка абавязкова ўпрыгожаны нашыўкай з рознакаляровых стужак з закругленымі ромбамі чырвонага колеру – “вачамі”, у сярэдзіне якіх – зоркі. І абавязкова ў чаравічках на абцасах, каб здалёк чуваць было! На галаве – “брыжы” з пучком рознакаляровага пер’я з хваста пеўня…Так апранаецца павіццеўская сваха.

З гэтай жанчынай у дом прыходзіла сапраўднае свята - яе з'яўленне на парозе азначала хуткае вяселле. У вёсцы свацці ва ўсе часы славіліся вясёлым норавам. У мясцовай культуры сваха - і тамада, і вясельны распарадчык у адной асобе, яна павінна была сачыць, каб госці былі сытыя і задаволеныя.

Сёння арыгінальныя касцюмы ёсць толькі ў музеях і прыватных калекцыях. Аднак яркі ўбор - не адзінае, чым адрозніваліся мясцовыя свахі ад сваіх калегаў або, правільней сказаць, канкурэнтаў у іншых беларускіх мястэчках. Яны ведалі мноства прыпевак і песень, многія з іх - у ходзе да гэтага часу. Так на трэці дзень вяселля, на пэрэзвах, вы пачуеце галасісты спеў свах:

Сілэ пярэзвы сілэ,
Сэвого вола з'ілы,
Сэвого рогатого
У свата богатого.

І толькі ў нас на вяселлі вы зможаце ўбачыць незвычайных мужчын з сумкамі наперавес– гэта баяры, хлопцы, якія дапамагалі нявесце пераносіць пасаг у хату жаніха.

А як вы трапіце ў нашу царкву, то наўрад ці зможаце адарваць позірк ад залацістых купалоў, якія сваімі крыжамі ўтапаюць у блакітных аблоках. І калі ярка засвеціць сонейка, то вам падасца, што сама Маці Божая ахутвае наш храм, які ўжо на працягу больш за 100 гадоў ні на дзень не спыняе сваіх богаслужэнняў.

Невядома, колькі сцежак давядзецца прайсці нам, падарожнікам, у гэтым жыцці. Але дзе б мы ні былі, куды б ні закінуў лёс, нас заўсёды будзе цягнуць на родную зямельку. У край, дзе зведалі першыя перамогі, першую радасць… Бо толькі тут сэрца адчувае сапраўднае шчасце і цеплыню. А ногі зноў, як у дзяцінстве, прабягуцца па знаёмых сцежках, завітаюць у садок да цёткі Марыі, а душа зразумее, як мала патрэбна для шчасця… Жыць на сваёй Радзіме!